Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem.

# НАПЕРАД!

Беларуская радыкальная тыднёвая часопісь.

Цана асобнага нумару 20 гр.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская 8, кв. 3.

Прыймо інтэрэсантаў ад 11 да 12 гадз. што-дня, апрача сьвятаў і нядзель.

Падпіска з дастаўкай да хаты: за 1 год—7 зл., за паўгоду—3 зл. 50 гр., за 3 мес.—2 зл., за 1 мес.—75 гр.

Год I. Вільня, 19 сьнежня 1929 г. №. 2.



## Споўнім наш абавязак!

У першым-жа нумары нашае часопісі мы зьмясьцілі на першай страніцы кліч:

„Бацькі! Не забывайцеся, што толькі да 31 сьнежня можна падаваць дэкларацыі аб беларускіх школах, калі хочаце іх мець на наступную восень!

„Няхай кожын год чуваць будзе ваш моцны голас з дамаганьнем роднае школы!“.

Сягоньня кліч гэты паўтараем. Бо ў нашай барацьбе за волю і адраджэньне нашага народу, за заваяваньне яму лепшага соцыяльнага ладу, за зямлю і права працоўных— *справа роднае школы стаіць на адным з найбольш пачэсных месц.* Бо мадняцьце культурнага роўня народных гушчаў — гэта наймагутнейшая зброя ў змаганьні за ясьнейшую будучыню — нашую і нашых дзетак.

Ведаюць гэта найлепей тыя сілы, што на цямноце народу будуюць свой дабрабыт. І робяць яны ўсё, каб адбіць у беларускіх масаў усялякую ахвоту да барацьбы за родную школу. Вось чаму гэтак туга, гэтакназьдзіў павольна, мо‘ ў тысячнай долі зьдзейсьняецца нашае права мець дзяржаўныя школы ў беларускай мове ўсюды, дзе мы гэтага жадаем.

Ворагі беларускае школы спадзяюцца, што ў нас ня хопіць нэрваў, ня хопіць цярплівасьці, каб кожын год выяўляць сваю волю ў справе роднае школы. Ды дарэмна: бо, хоць запраўды ў людзей слабых духам могуць апускацца рукі, бачучы, што падаваныя дагэтуль што-году тысячы дэклярацыяў за беларускія школы не дасягаюць сваей мэты і астаюцца „голасам гукаючага ў пустыні“, — аднак, мы ведаем, што ворагі нашыя толькі на гэта й чакаюць. І мы *не падзем духам*!

І сёлета, як у мінулыя гады, моцны голас нашага сялянства хай пацьвердзіць непарушную, нязьменную волю яго мець беларускую школу. Не паддамося зьнеахвочаньню, не паддамося безнадзейнасьці.

Усе разам, дружна і сьмела *патрэбуем мы таго, на што маем і маральнае, і фармальнае права.* Гэта — наш абавязак, нашая павіннасьць і перад сучасьнасьцяй, і перад будучынай.

Дык да працы! Хто дагэтуль ня споўніў гэтага свайго абавязку, *хай споўніць яго ў апошнія дні, якія нам яшчэ асталіся*!

## Як пасьцелешся, так і высьпішся.

Апошнія падзеі ў Польскім Сойме, закончыўшыся, як ведама адстаўкаю Ураду, зьяўляюцца рэзультатам барацьбы паміж Соймам і Урадам за ўладу. Сойм выражаючы недаверра Ураду, паклікаўся на невыконваньне ўрадам абавязуючых законаў і непашану да канстытуцыі і г.д.

Калі разважаць гэтую спробу аб‘ектыўна, дык, зразумела, прыдзецца згадзіцца з тым поглядам, што закон павінен быць выконваны аднолькава ўсімі—Прэзыдэнтам і слугою, генэралам і салдатам, старастам і сторажам, бо-ж у дэмократычнай рэспубліцы, якою фармальна лічыцца Польшча, усе роўныя перад Законам.

Аднак, незважаючы на гэту, здавалася-бы, зусім слушную пазыцыю Сойму ў барацьбе яго за выканаьне законаў, ён неяк мала мае да сябе спагаду з боку шырокіх слаёў грамадзянства, што-ж датачыць адносінаў да гэтае соймавае акцыі беларускага грамадзянства, дык трэба шчыра зазначыць, што адносіны гэтыя можна было-б назваць вясёлымі. Беларускае Грамядзянства, стоючы збоку, толькі пасьмейваецца, бо-ж у сур‘ёз гэтага соймавага трагізму браць ня можа.

Сойм закрычаў „караул“ на ўвесь сьвет толькі тады, калі ўшчамілі яго самога; калі-ж гэта датычыла другіх, калі невыконваньне законаў і іх гвалчэньне навет пры чыста „парляманцкіх“ урадах адбілася ня толькі на целе, але і на душы беларускага народу — дык і ППС, і НПР, і ХД, і НД, і ўсе тыя, што сёньня так бароняць законнасьць, толькі пасьмейваліся. І ў пару, здаецца, будзе сёньня прыпомніць паном паслом аб нячуваным у гісторыі парляментарызму арэшце паслоў беларускае салянска-работніцкае Грамады, без папярэдняе згоды Сойму. А пасьля тыя-ж паны паслы з пад таго-ж самага знаку НПР, Эндэкаў і Хадэкаў узаконілі яго, сваім галасаваньнем, прызнаўшы такое нарушэньне канстытуцыі — дапусьцімым, калі справа йшла аб беларусах. — Гэта-ж тыя самыя польскія партыі ў 1924 годзе зацьвярдзілі крыўдныя для ўсіх меншасьцяў, не зважаючы на іх дружны пратэст, так-званыя „языковыя законы“. А хіба-ж ня ведама было паном, сяньнешнім абаронцам законнасьці, што на‘т і гэты крыўдны закон нідзе на працягу вось ужо 5 гадоў ня выконваецца? Усім аж надта добра ведама, што беларускі народ у працягу гэтых 5-х гадоў злажыў дзесяткі тысяч дэкляраццыяў на беларускую школу, злажыў на падставе істнуючага закону і дагэтуль амаль што нічога не атрымаў?! Ці ўрэшце ня ведамы і той факт, што сам сойм у сваім часе зацьвярдзіў буджэт на ўрадовую беларускую вучыцельскую сэмінарыю, а ўрад ня толькі дасюль яе не адчыніў, але й не дае дагэтуль канцэсіі на прыватную вуч. сэмінарыю і адно-гадовыя вуч. курсы, якіх дабіваецца Беларускі Вуч. Саюз?! Усё гэта добра было ведама паном паслом і справа, і зьлева; аднак — за вынятккм нялічных чэсных адзінак — яны на гэта ня толькі не рэагавалі, але, як паказаў прыклад з арыштамі Грамадаўскіх паслоў, самі ўзаконівалі дакананае нарушэньне канстытуцыі.

Вось чаму цяпер беларускае грамадзянства зусім не рэагуе і не прымаецца крыкам опозыцыі. Усе Вы, паночкі, добранькія тады, як Вас ушчамяць і пакуль-жа гэтага няма, дык Вы і самі не адтаго, каб дапамагчы зьдзекавацца над другім.

Вось як небясьпечна падтасоўваць закон да паасобных мамэнтаў; вось, як небясьпечна станавіцца на шлях бяспраўя, бо-ж у канцы канцоў адаб‘ецца гэта і на тым, хто гвалт учыніў над другімі.

Праўдзівая народная прыказка: „Як пасьцелешся, так і высьпішся“.

Эра.

## Распаляйце!

Распаляйце ясна горны,  
разгарыцца вугаль чорны  
полымем-агнём.  
Дзьміце, каб мяхі гудзелі,  
іскры з посьвістам ляцелі  
яркім прамянём,  
і жалеза награвайце,  
награвайце, напалайце  
на чырвоны цьвет.  
Захваціце абцугамі  
і ударце малатамі,  
каб аж тросься сьвет!  
Прыударце з гулкім звонам,  
молат ўзлётам. Жмі з разгонам,  
з прызванам лупі!  
Іскры сыпнуць хай завеяй  
на лепшыя дні.  
Распалайце, куйце сьмела,  
ну-це клопцы, гэй, да дзела!  
Сьмехам рве гарно.  
Вы са штабаў зімнашэрых  
Прапай ёмкай, працай вернай  
Скуеце хоць што.

А. Б.

# З Радавае Беларусі.

### Ані КПБ, ані Камсамол ня бачылі „правага ўхілу“ і „нацыянал-дэмакратузму“.

Паход, распачаты ў Радавай Беларусі проці беларускіх камуністаў і беларускіх дзеячоў наагул, „сталікаўцы“ тлумачаць „правым ухілам“, быццам-то выяўленым беларусамі. Аднак, да выступленьня ў „Комсомольской Правде“ нейкага маскоўскага „апякуна“ беларусаў, таёмнага А. І., ніякага „правага ўхілу“ ня бачылі ані Камуністычная Партыя, ані—Камсамол. „Пабачылі“ тады, як выйшаў прыказ „бачыць“—з Масквы. А тады паднялі галаву ўсе маскоўскія шовіністы ў Кам. Партыі, якім гадамі сэрца балела, гледзячы на росквіт беларускае культуры, якім улада беларускіх работнікаў і сялян ня раз „біла па лапах“ за паскудную зьвягу на ўсё беларускае.

Мы падаем ніжэй цэлы рад выступленьняў „патэнтаваных“ камуністаў расейскае і жыдоўскае нацыянальнасьці, якія мімаволі сьцьвярджаюць справядлівасьць вышэйсказанага.

Вось, выняткі з іх прамоваў на сходзе менскага партактыву згодна з справаздачай „абноўленае“ „Савецкае Беларусі“ з 17.IX. 1929:

> Тав. **Мар'ясін**, гаворачы аб саматужнапрамысловай каапэрацыі, паказвае на тое, што арцелі, якія захапляюцца сампрамкаапэрацыйным аб‘яднаньнем, былі засьмечаны да 1927 году, г. зн. да таго часу, калі там былі ранейшыя кіраўнікі. У рабоце саматужна-прамысловай каапэрацыі,—кажа прамоўца,—**ня было сьвядомага ажыцьцяўленьня права-апартуністычных тэорый** у практычнай рабоце, а было дапушчана на пэўным адрэзку часу **рад палітычных памылак.** Гэтыя памылкі мы зараз з усей сілай і павінны выпраўляць пры дапамозе ўсяе партарганізацыі.

А вось — на фроньце культурна-нацыянальным:

> Тов. **Челядинский** лічыць, што т. Гамарнік у сваім дакладзе, націскаючы на праявы правага ўхілу на эканамічным фроньце (Наркамзем, саматужна—прамысловая), ня спыніўся як трэба на праявах правага ўхілу і на культурна-ідэалёгічным фроньце.
>
> Мы цярпелі гадамі прапаганду контрэвалюцыйнай нацыянал-дэмакратычнай ідэалёгіі праз часопісь „Полымя“, „Савецкую Беларусь“, праз некаторыя падручнікі... У свой час ня лічылі патрэбным рашуча змагацца з гэтым.
>
> Ці займаліся мы як трэба вывучэньнем цэлага раду важнейшых у вашых умовах гэтых зьявішч, ці ведама, як належа, партыі, аб гэтых працэсах, ці мабілізаваны масы на рашучую барацьбу з нацыянал-дэмакратызмам? Трэба прызнацца, што не: спазьніліся, як адзначала перадавая „Зьвязды“ і адозва верасьнёўскага пленуму ЦК КП(б)Б. Адзіная толькі „Зьвязда“ сыгналізавала аб небязьпецы. У часы тэатральнай дыскусіі „Зьвязда“ і перад усімі сарвала „самабытную“ маску, за якой хаваўся доўгія гады нацыянал-дэмакратызм, рынулася на рашучую барацьбу з ім, але... трэба шкадаваць, што трымала ў гэтай барацьбе „рубцы“ ня так ад ворага, як ад свайго прыяцеля... „Савецкая Беларусь“—апынулася зброяй у руках нацыянал-дэмакратаў для барацьбы са „Зьвяздой“ супроць лініі КП(б)Б. Зараз вышаў з друку чарговы (ліпеньскі) нумар „Полымя“ і рэдакцыя (ужо абноўленая) ні адным словам не абмовілася аб памылках часопісі, аб тым, што яна асуджае старую нацыянал-дэмакратычную лінію часопісі, і што гэтую лінію бярэцца выправіць пабальшавіцку.
>
> Наша Акадэмія Навук, створаная ў выніку кастрычнікавае рэвалюцыі, у выніку ўмацаваньня дыктатуры пралетарыяту, павінна быць лябараторыяй для вырабу на аснове марксыцка-ленінскага вучэньня нам навуковых сродкаў для пабудовы Соцыяльнай Беларусі. Ці так яно ёсьць сёньня на справе? Ня зусім. Мы павінны ўлічаць „пляску“ нацыянал-дэмакратаў Зах. Беларусі, ксяндза Станкевіча і К-о, якія сьцьвярджаюць, што акадэмія „іх“—нацыянал-дэмакратычная.

А вось—„найстрашнейшая“ праява „правага ўхілу“ на культурным фроньце: акадэмік С. Некрашэвіч, працуючы над старой беларускай літэратурнай мовай, вывучыў і напісау расправу аб мове рукапісу XVII ст. нейкага Касьяна Ераміты. На няшчасьце, гэны Касьян быў—манахам. І за гэты „грэх“ Касьяна дастаецца С. Некрашэвічу, хаця той вывучаў не „божэственны“ зьмест твору Касьянавага, а выключна—асаблівасьці мовы яго! Паслухайце-ж, як гаворыць аб гэтым „праступку“ „товарищ Челядинскій“:

> А паглядзіце, чым займаюцца акадэмікі „савецкае“ маркі, скажам як С. Некрашэвіч, за „савецкасьць“ якога некаторыя нашы адказныя таварышы гатовы пабіцца. Вось перад вамі таў-

шчэразная кніга—Запіскі Аддзелу Гуманітарных Навук Акадэміі. Якая роскаш, выдана на лепшай паперы, з клішэ і рознастайнымі шрыфтамі. У ей выдрукавана праца С. Некрашэвіча. Праца акадэміка С. Некрашэвіча прадстаўляе сабою „салідны“ досьлед нейкага „сьвятога пісаньня прэпадобнага айца Касьяна Вераміты“ XVII стагодзьдзя.

Ня будзем сароміць сябе, гаворачы аб гэтай працы памінам аб марксызме, што пры крытыцы гэтага „навуковага“ досьледу Некрашэвіча трэба карыстацца цытатамі Маркса ці Леніна, даказаць, што для сучаснасьці ў палітычным сэнсе гэты „досьлед“ „сьвятой пісаніны“ „отца“ Касьяна Вераміты—непатрэбная рэч, ён і ў навуковым сэнсе грошу—ня варты!

Кажуць, што гэта робіцца для ўзбагачаньня культуры беларускае мовы—дык вучэцеся, татаварышы, беларусізуйцеся па „сьвятому пісьму прэпадобнага отца Касьяна Вераміты“.

Сур'ёзна, таварышы, трэба ставіць пытаньне аб рабоце нашай Акадэміі. Там слабы партыйны комуністычны асяродак. Там амаль адсутнічаюць навуковыя марксыцкія кадры. Пара ў Акадэмію накіраваць жывую крыніцу вылучэнцаў, навуковых працаўнікоў камуністых. Пара ЦК. КП(б)Б. паставіць пытаньне аб мобілізацыі якой небудзь сотні, ці больш камуністых на вучобу ў марксыцкія ВНУ Савецкага Саюзу. Трэба ўмацаваць культурна-ідэалёгічны фронт.

**А вось яшчэ два характэрныя галасы,—галасы ізноў-жа небеларускія:**

Тав. **Шапіра.** Задачай партактыву зьяўляецца гарантаваць сваей актыўнай працай поўнае выкананьне пастаноў апошняга пленуму ЦК. КП(б)Б., якія зьяўляюцца бязумоўна правільнымі і своячаснымі.

Ні ў дакладзе тав. Гамарніка, ні ў артыкуле ў „Звязьдзе“ (ад 8 га верасьня) няма адказу на адно з важнейшых пытаньняў, якія мы павінны задаць ЛКЦК., так і „Зьвязьдзе“, як гэта здарылася, што ў важнейшым пытаньні клясавай барацьбы ў Беларусі, у пытаньні аб барацьбе з нацыянал-дэмакратызмам патрэбавалася дапамога? Што „Камсамольская Правда“ адказала дапамогу ў гэтым пытаньні, сьцьвярджае і артыкул „Зьвезды“ і тав. Гамарнік. Няўжо-ж без дапамогі „Камсамольскай Правды“ ніяк нельга было абайсьціся?

Таварыш **Ерухімовіч.** Я лічу патрэбным і карысным для партыі назваць тыя скажэньні, якія мелі месца ў БССР. сваім поўным імем. Запраўды, хто адказвае за хутарызацыю Беларусі? Хто адказвае за гэты „пасьпех“ Наркомзему, які змог за пяць гадоў „абагнаць і перагнаць“ Сталыпіна? Ці адзін былы нарком Прышчэпаў? Не. **Адказвае і ЦК. КП(б)Б.** Факты гавораць аб гэтым. І ад гэтых фактаў не схавацца. Яшчэ ў 1926 годзе камісія ЦК. КП(б)Б. па гаспадарчым будаўніцтве, заслухаўшы даклад Наркамзему, пастанавіла „лічыць неабходным падтрымаць у БССР. пасёлкавую форму „землякарыстаньня“.

У лютым 1928 г., ужо пасьля 15 партзьезду, пленум ЦК. КП(б)Б. адзначыў, што „практыка арганізацыі пасёлкаў паказала, што гэта форма зьяўляецца жыцьцёвай“.

Тое самае адносна нацыянал-дэмакратызму. Чым тлумачыць, што ён так абнаглеў? Ці толькі „аб'ектыўнай“ умовай—тым, што, бачыце, кулак вырас? Нельга ўсё ўзваліваць на „аб'ектыўныя“ ўмовы. Нацыянал-дэмакратызм вырас, умацніўся і абнаглеў і яшчэ таму, што з ім, па' сутнасьці, вельмі мала змагаліся. Гэта таксама факт, які нельга абвергнуць.

Хіба-ж аб апартуністычнай палітыцы Наркамсавета Баліцкага ЦК КП(б)Б. нічога ня ведаў? Хіба-ж з нацыянал-дэмократычнай інтэлігенцыяй, з нацыянал-дэмакратамі тыпу Жылуновіча, якія залезьлі ў партыю, змагаліся? Не! З імі цацкаліся, з імі насіліся, супроць іх у БССР нельга было і выступаць! Цэнтральны орган КП(б)Б. „Зьвязда“ ня раз атрымлівала па руках за спробу даць адказ на атакі нацыянал-дэмакратаў супроць бальшавізму.

„Зьвезда“, гэта трэба проста сказаць, часта была адзінкай у гэтай барацьбе. ЦК. КП(б)Б. ахвотна падстаўляў сваю газэту пад удар, але не даваў у крыўду „багоў“ з лягеру Жылуновіча, Баліцкага і іх партыйных, а галоўным чынам, безпартыйных прыяцеляў.

Тыя матэр'ялы, якія ёсьць у маім распараджэньні, сьведчаць аб тым, што ўзмацненьне нацыянал-дэмакратызму мае сувязь ня толькі з актывізацыяй кулацтва, але і з тым, што ў нашым пролетарскім лягеры зроблены буйнейшыя памылкі. Чым вытлумачыць тое, што **камсамол**, найважнейшая палітычная арганізацыя, стаяў на баку ад барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам?

Думаем, што гэтыя заявы „патэнтаваных“ камуністаў гавораць самі за сябе. Паўтараем: яны паказваюць, што „правы ўхіл“ і „нацыянал-дэмакратызм“ беларускіх камуністаў сьвядома **сфабрыкаваны запраўды-ж абнаглеўшым пад дыктатурай Сталіна маскоўскім нацыяналізмам,** каб апраўдаць паход проці ўсяго беларускага, а перад усім—**проці беларускіх культурных працаўнікоў,** без якіх будаўніцтва беларускае культуры зьяўляецца пустым гукам.

(Працяг будзе).

# Палітычнае жыцьцё.

## Польшча.

### Урадавы крызыс.

У справе тварэньня новага ўраду Прэзыдэнт Рэспублікі адбыў рад канфэрэнцыяў з павадырамі галоўных соймавых партыяў, за выняткам нацыянальных меншасьцяў і з радам іншых выдатных, а нават і нявыдатных асабістасьцяў.

Як паведамляюць „уплывовыя колы“, канфэрэнцыі гэтыя мелі мэтай — інфармаваньне п. Прэзыдэнта аб настроях у Сойме і паглядах яго павадыроў на справы, зьвязаныя з стварэньнем новага ўраду.

Орган урадавай групы кракаўскіх консэрватараў, газэта „Час“, дасьціпна, але няведама, ці праўдзіва, цьвердзіць, быццам усе гэтыя гутаркі п. Прэзыдэнта з павадырамі Сойму маюць мэтай—„прыцісьнуць да муру“ гэтых павадыроў, якія змушаны даць „адмоўны адказ на пытаньне, ці радзяць яму стварэньне парлямантарнага габінэту і ці могуць запэўніць такому габінэту большасьць у Сойме“. „А тады астанецца адзін толькі выхад для Прэзыдэнта: зрабіць з гэтых радаў вывад і—ўтрымаць сучасную сыстэму непарлямантарнага ўраду, ак адзіную магчымую“.

Гэтую, быццам абсалютную немагчымасьць для соймавай апазыцыі стварыць парляманцкі габінэт асабліва падчырківае ўрадавая прэса. Але—як бы ў адказ на гэта—13.XII у газэтах апазыцыйнага „цэнтралеву“, з пачыну якога вышла прапазыцыя—выразіць недаверра ўраду Сьвітальскага, быў надрукаваны такі камунікат:

„Апазыцыйныя партыі ня хочуць і ня могуць умешывацца ў правы п. Прэзыдэнта Рэспублікі ў галіне стварэньня ўраду, а ў першую чаргу—ў яго права назначэньня прэмьера. Але—на выпадак, калі-б п. Прэзыдэнт прызнаў патрэбным даручыць стварэньне ўраду каму-нібудзь з прадстаўнікоў апазыцыі, даручэньне гэтае будзе прынята, і такім парадкам створаны ўрад бяз сумліву лічыць на супрацоўніцтва і на падтрыманьне з боку большасьці Сойму“.

Такім чынам, апазыцыйны „цэнтралеў“, да якога далучыўся і клюб „сялянскай партыі“, зусім не адмаўляецца прынцыпова ад стварэньня сваімі сіламі парлямантарнага ўраду. Іншая рэч, ці такі ўрад меў-бы якую сілу дый патрапіў-бы што зрабіць па за межамі Сойму...

Як завяршэньне гэтай **першай** фазы крызісу, п. Прэзыдэнтам склікана была на аўторак супольная канфэрэнцыя ўсіх старшыняў Соймавых клюбаў, якія ўжо былі прыняты Прэзыдэнтам паасобку. Ад яе спадзяваліся, што пасьля яе справа назначэньня новага ўраду—ўраз-жа будзе вырашана. Аднак, спадзяваньне гэтае ня зьдзейсьнілася, і ў мамэнт здачы газэты на машыну вестак аб складзе новага ўраду ня было, хацця, як відаць, да нейкага паразуменьня ўжо дайшло.

## Заграніцай.

### Нямеччына.

12.XII нямецкі канцлер (премьер) Мюльлер сказаў у Рэйхстагу (парляманьце) вялікую бюджэтную прамову,—у якой даў агляд сучаснага гаспадарчага і фінансавага стану Нямеччыны і—мераў ураду дзеля яго направы. Дадзеныя канцлера Мюльлера запраўды-ж даводзяць вялізарных высілкаў ураду і вялікай гаспадарчай сілы нямецкага народу ў працы над адбудовай і разбудовай жыцьця краю. Бо-ж—нягледзячы на страшэнна цяжкія штогодніа ваенныя адшкадаваньні пераможцам—па некалькі мільярдаў марак,—новы бюджэт Нямеччыны прадбачыць вельмі значныя палёгкі—падаткавыя і іншыя—шырокім колам насяленьня краю.

Бюджэт прадбачыць, напр., **паніжэньне падаткаў усяго на суму 915 мільёнаў марак** у 1930/31 г. Гэтак маюць быць звольнены ад параходнага падатку цэлыя клясы падатнікаў гэтага году, бо сума падлягаючага абложэньню падаткам гадавога даходу будзе значна павышана; падатак на цукер мае быць зусім скасаваны, што зробіць гэты важны ежінны прадукт значна танейшым—даступным для небагатых людзей; прамысловы падатак мае быць паніжаны на $^{1}/_{5}$ частку, а грунтовы (зямельны)—на $^{1}/_{10}$ частку і т. д.

Новы бюджэт апрацаваны міністрам-сацыялістам Гільфэрдынгам і мае ўсе шансы быць прынятым у галоўных сваіх падставах парлямантам. Бо-ж толькі што 14.XII Рэйхстаг пасьля агульнай дыскусіі над бюджэтам выразіў ужо — большасьцю 222 галасоў проці 156 пры 22 устрымаўшыхся, ураду Мюльлера сваё даверра.

### Чэха-Славацыя.

У Чэха-Славацыі толькі што скончыўся ўрадавы крызіс, які трываў нябывала доўгі час—амаль не паўтара месяца!

Папярэдні ўрад зложыў фармальна свае паўнамоцтвы 26.X.—напярэдадні парляманцкіх выбараў, якія адбыліся, як ведама 27.X.

І вось, толькі 7.XII. увечары былі назначаны прэзыдэнтам сябры новага габінэту.

Польшча так сама цяпер перажывае ўрадавы крызіс—таму вельмі цікаўна бліжэй прыглядзіцца да таго, як узнік, як ішоў і як зьліквідаваны крызіс ураду ў нашай найбліжэйшай суседкі, у якой Польшча можа шмат чаму навучыцца.

Паўтара месячны ўрадавы крызіс у такой **чыста парлямантарнай** дзяржаве, як Чэха-Славацыя, гэта-ж адначасна—**крызіс парляманцкі.**

Справа ў тым, што ў такой парлямантарнай дзяржаве ўрад выдзяляецца з парляманцкай большасьці. А якраз новыя выбары ў Чэха-Славацыі ізноў стварылі такі Сойм, у якім ня толькі ня мае абсалютнай большасьці ніводная з партыяў краю (найлічнейшая з іх „аграрная“ — мае толькі 16% усіх мандатаў Сойму!), але ня могуць зложыць патрэбную большасьць—кожная асобна—нават згуртаваныя буржуазная ці сацыялістычныя групы парляманту.

У папярэднім Сойме прынамся магла стварыцца большасьць шляхам коаліцыі буржуазных фракцыяў, якая і выдзяліла з сябе ўрад. А цяпер—парлямант павінен быў вырашыць значна цяжэйшую задачу—**стварыць урадовае паразуменьне паміж буржуазнымі і сацыялістычнымі групамі.**

І вось $5^{1}/_{2}$ тыдняў крызісу і пайшло якраз на гэтыя в. цяжкія перагаворы аб стварэньні шырокай урадавай коаліцыі, у якую ўвайшлі галоўныя як буржуазныя, так і сацыялістычныя групы Сойму.

Наскольні цяжкі быў гэты міжпартыйны кампраміс, відаць з таго, што ў коаліцыю ўвайшлі, напр., чэска-славацкія „рэспубліканскія зямляўласьнікі“—поруч з сацыял-дэмакратамі, партыяй, баронючай інтарэсы мястовага і сельскага пралетарыяту! Можна розна ацэніваць з клясавага пункту гледжаньня такі кампраміс, але трэба сьцьвярдзіць, што ў гэтым кампрамісе быў адзіны выхад для стварэньня парлямэнтарнага ўраду ў Чэха-Славацыі, і яе палітычныя павадыры, цэнючы вышэй усяго гэтую вярхоўную ўладу свайго парляманту, пайшлі на кампраміс сьведама. Бо-ж іншыя выхады былі-б такія: або новыя выбары, на што шкода было грошаў—бяз пэўнасьці, што новы парлямэнт будзе іншы, як гэты, а на апошнія выбары выкінена было 83 мільёны каронаў; або—чыноўніцкі габінэт, назначаны прэзыдэнтам, што так сама не вырашала-б **парляманцкага крызісу,** пазбаўляючы адначасна ўрад усялякай сілы і творчай думкі, усялякай самастойнасьці—на падставе паўнамоцтваў, дадзеных—праз парлямант—народам...

Чэха-Славацкі парлямант складаецца амаль не з паўтара дзесятку розных фракцыяў, з якіх у новую ўрадавую коаліцыю ўваходзіць аж 8 клюбаў—самага рознага—палітычнага, сацыяльнага і нацыянальнага характару. Склад гэтай новай—„концэнтрацыйнай“ урадавай большасьці ў Сойме—такі:

Буржуазная частка яе складаецца з 5 партыяў:

1. „Чэха-славацкай рэспубліканскай аграрнай (зямляўласьніцкай) партыі, якая атрымала 4 партфэлі (міністэрск. мейсцаў), у тым ліку—прэмьерства;
2. „Чэскай каталіцка-людовай партыі“, атрымаўшай 2 партфэлі;
3. „Чэскай мяшчанскай (рамесьніцкай) партыі“—1 партфэль;
4. „Чэскіх нацыянал-дэмакратаў“—з 1 міністрам і
5. „Нямецкіх аграрыяў“ з 1 міністрам.

Сацыялістычная група складаецца з 3 партыяў:

1. Чэха-славацкіх сацыял-дэмакратаў, атрымаўшых 3 партфэлі ў габінэце;
2. Нямецкіх соц.-дэмакратаў—з 1 партф.;
3. Чэскай нацыянальна сацыялістычнай партыі (Бэнэша)—з 3 партф.

Партфэль мін. фінансаў даручаны ведамаму фахоўцу—фінансісту праф. Энглішу, займаўшаму тое-ж становішча ў папярэднім урадзе.

З партыяў папярэдняй урадавай коаліцыі—чыста буржуазнай—не ўвашлі ў склад новай шырэйшай коаліцыі 2 партыі: нямецкія хрысьціянскія сацыялісты і—„Славацкая каталіцкая сялянская партыя“ ведамага павадыра славацкіх нацыяналістаў,—былых незалежнікаў—кс. Глінкі. Гэтая амаль ня поўная адсутнасьць у новай коаліцыі славацкага элемэнту зьяўляецца самым слабым яе мейсцам.

### Англія і ССРР.

13. XII радавы пасол Сакольнікаў прыбыў у Лёндан.

У той жа самы дзень англійскі пасол Эсмонд Овэй прыехаў у Маскву. Такім чынам афіцыяльна і фактычна ўзнавіліся дыплёматычныя адносіны паміж Англіяй і ССРР.

Напярэдадні гэтага ў англійскім парлямэньце консэрватары зрабілі апошнюю спробу затрымаць прыезд англійскага пасла ў Маскву, дамагаючыся, каб уся справа была нанова разгледжана ў парлямэньце, як быццам абяцаў гэта ў „пратаколе“ Мак-Дональд. Але Гэндэрсон рашуча ўспрацівіўся гэтаму.

### Кітай.

Пакуль Мукдэнскі ўрад вядзе перагаворы з Радамі аб зьліквідаваньні паваеннага канфлікту з прычыны ўсходня-кітайскай чугункі, нанкінскі ўрад, які пад націскам розных дарадцаў—ставіў розныя перашкоды гэтаму мірнаму паразуменьню,

спадзяючыся тэй ці іншай дапамогі з боку вялікіх дзяржаваў, сам папаў у вялізарную бяду. Ці дапамогуць Нанкіну гэтыя дзяржавы вызваліцца хадя-б з гэтай сваей бяды, і гэта—сумліўна. Паўстаньне проці Нанкіну ахапіла ўжо вялізарныя абшары, а паўстанцы наблізіся да Кантону. Праўда, апошняя вестка з Шанхаю кажа аб значнай пабедзе ўрадовых войскаў над Кантонам, але ці на гэтым скончацца пасьпехі паўстанцаў, няведама. З другога боку над каркам Манджуры стварылася новая пагроза—ў відзе толькі-што абвешчанай „Мангольскай радавай рэспублікі"—з сталіцай у Хайлары. Гэты новы факт, праўду кажучы, можа выклікаць новыя аслажненьні, новае ўмяшацельства з боку чужых дзяржаваў, на гэты раз—ня толькі Амэрыкі, Францыі, Англіі і інш., але так сама і Японіі, якая, як ведама, ўстрымалася—побач з Нямеччынай, ад далучэньня да пратэсту проці радава-кітайскай вайны—на падставе пакту Кэллога. Справа—ў тым, што нова-створаная Манджурская радавая рэспубліка пэўне-ж далучылася да С.С.Р.Р.! А гэта выразна нарушае цэласьць і непадзельнасьць кітайскай дзяржаўнай тэрыторыі, якую загарантавалі Амэрыка і Японія (!)

Такім чынам—на абодва бакі ад распачаўшайся, быццам павsituation, „мірнай канфэрэнцыі" дэлегатаў манджурскага і радавага ўрадаў—у справе зьліквідаваньня ваеннага канфлікту— вырастаюць новыя небясьпекі: на поўначы Кітаю пагражае новы канфлікт шырока міжнароднага характару, а на поўдні—катастрофа цэнтральнага ўраду Кітаю... Усё гэта даводзіць, што выпрашэньне кітайскай проблемы ідзе нейкімі блуднымі шляхамі і няправільнымі спосабамі, дый што ўсе чысьленыя „прыяцелі" кітайскага народу—псуюць яму справу поўнага вызваленьня яго...

# Водгукі сьвяткаваньня дзесятых угодкаў сьмерці Ів. Луцкевіча.

Сьвяткаваньне дзесятых угодкаў сьмерці Івана Луцкевіча, якое было аддаваньнем апошняе пашаны змагару за нашыя сьвятыя ідэалы, не магло прайсьці міма, каб ня выклікаць большага ўражаньня так сярод беларускага грамадзянства, як і ў некатарых не беларусаў.

Між іншым трэба адзначыць, што ў некаторых мясцох на правінцыі, стараньнямі мясцовага насяленьня прыгатаўляюцца таксама спэцыяльныя сьвяткаваньні, дзеля ўшанаваньня сьветлае памяці Івана Луцкевіча.

Гэты мамэнт быў таксама адзначаны і ў віленскай прэсе. Між іншым апошні 1 (12) нумар „Студэнскае Думкі" быў вылучна пасьвячаны 10 угодкам сьмерці Івана Луцкевіча і 400-лецьцю статуту Вял. Кн. Літоўскага.

Адзначала гэты мамэнт таксама і польская дэмократычная прэса, як „Kurjer Wileński" і „Przegląd Wileński", які ў № 20—21 з 24.XI, 29 г. зьмясьціў вялікі артыкул аб Івану Луцкевічу, пасьвячаны дзесятым угодкам ягонае сьмерці.

Немагчыма прайсьці міма, каб не падкрэсьліць тае сумнае ролі, якую адыграла ў зьвязку з апошнім „Беларуская Крыніца", ведамая сваімі неабаснаванымі лаянкамі на ўсё тое, што толькі ёсьць не хадэцкае. Вось-жа „Беларуская Крыніца" ў № 35 з дня 24.XI-29 зьмясьціла аж цэлы артыкул п. н. „Беларускія палітычныя пагарэльцы над магілай Ів. Луцкевіча", у якім, замест разам з усім грамадзянствам ушанаваць сьветлую памяць Ів. Луцкевіча, стараецца гэты мамэнт зрабіць аружжам у барацьбе з сваімі працаўнікамі. Пэўне-ж, можна лаіцца і змагацца, але трэба ведаць, што і лаянка мае свае граніцы, што ўжываньне дарагога ўсім імя Івана Луцкевіча дзеля асабістых лаянкаў, ёсьць рэчай неэтычнай, тымбольш неэтычнай, што гэта робіць ворган Беларускай Хрысьціянскай дэмократыі, якая, згодна з сваім статутам, стаіць на абароне агульнае этыкі.

У голас „Беларускай Крыніцы" ўторыць і „Vilniaus Rytojus", які ў № 58 з дня 22.XI-29, абураючыся, што гр. Ст. Станкевіч у сваім рэфэраце на Акадэміі між іншым адзначыў, што, „калі ў 1917 г. немцы прыступілі да тварэньня Літоўскае Тарыбы на крыўдных варунках для Беларусаў, то Іван Луцкевіч протэстуе супроць гэтага гвалту", заяўляе, што гэта-няпраўда, а дзеля гэтага стараецца паніжаць у вачох сваіх чытачоў той вялікі для нас мамэнт, якім было ушанаваньне сьветлае памяці Ів. Луцкевіча.

Сапраўды трэба прызнаць, што можа няпрыемна сяньняшнім Літвіном успамінаньне таго факту, калі ў часе тварэньне Літоўскае дзяржавы яны стараліся выкарыстаць Беларусаў дзеля сваіх уласных мэтаў. Мы заўсёды стаім на тым груньце, што пры супольнай працы беларускага і літоўскага народу трэба абмінаць усе тые мамэнты, якія могуць паслужыць дзеля ўзаемнага непаразуменьня.

Але рэдактары „Vilniaus Rytojus", якія так ня любяць слухаць праўды, хіба забываюцца аб тым, што калі Літвіны на ўвесь сьвет крычаць, што Віленшчына і Горадзеншчына ёсць землі этнографічна літоўскімі, то хіба-ж прыемна слухаць Беларусам гэтае недарэчнасьці?

Ж—іч.

# Хроніка.

+ **Абцяжэньне Віленшчыны падаткамі.** Кажуць, што часамі і каменьні могуць галасіць. Да такога галашэньня каменьняў трэба залічыць стацьцю абшарніцкага органу „Słowo" з 14 сьнежня, у якой падлічана, што толькі за зямлю Віленшчына плаціць падаткаў аж 15 мільёнаў злотых у год. Калі-б даходнасьць зямлі ў нас была высокая, дык гэтая сума, кажа газэта, ня была-б страшная (ведама, для абшарнікаў, але не для сялян!). Але, раўнуючы да даходу з зямлі, гэта вельмі многа: бо зямля дае ў год на 90 мільёнаў злотых прадуктаў на рынак, а вёска мусіць купляць газы, мыла, штучных гнаёў, прыладаў і ўсяго таго, чаго на вёсцы няма,—ажно на 100 мільёнаў. Дык ужо тут маем недахоп 10 мільёнаў, а 15 мільёнаў падаткаў—вось і цэлых 25!

На-жаль, абшарніцкая газэта ня кажа, што галоўны цяжар гэтых падаткаў ляжыць на малазаможным сялянстве, бо-ж абшарнікі, якія маюць зямлі ў 100 і балей разоў больш, чым сяляне, ня ўжываюць у 100 разоў болей мыла, газы і інш., чым сяляне.

Як-ні-як, а пры такіх варунках ападаткаваньня Віленшчыны—надта цяжкое.

+ **Памінаньне Ів. Луцкевіча на вёсцы.** У сувязі з дзесятымі ўгодкамі сьмерці Ів. Луцкевіча, якія гэтак урачыста абходзіла Вільня, пачала ладзіць гэткія-ж абходы і вёска. Гэтак адбыўся абход у Ашмяне ў мінулую нядзелю, 15 сьнежня, а 21-га сьнежня ладзіцца ў Маладэчне (у Вялікім Сяле, у хаце Сымона Бондара). Тут рэфэрат аб жыцьці і працы Ів. Луцкевіча прачытае Ст. Станкевіч, а пасьля будуць дэкламаваны вершы, пасьвячаныя памяці вялікага беларускага дзеяча. У канцы будуць пяяцца беларускія песьні („Не пагаснуць зоркі ў небе" і інш.). Пачатак у 4 гадз. папал.

Нас інфармуюць, што абходы маюць быць ладжаны і ў іншых мясцох.

+ **„Студэнская Думка".** Вышаў № 1 (12) „Студэнскае Думкі" з вельмі цікаўным і багатым матэрыялам, у прыгожай каляровай вокладцы, на добрай паперы і з рысункамі. Нумар амаль вылучна пасьвячаны двум прыпаўшым на гэты год вялікім юбілеям—10-угодкам сьмерці Ів. Луцкевіча і 400-лецьцю „Літоўскага Статуту". Цана асобнага нумару—1 зл. Купляць і выпісываць можна ў рэдакцыі—Вільна, Людвісарская 1—19 і ў усіх беларускіх віленскіх кнігарнях.

+ **З жыцьця беларускага студэнства.** Беларускае студэнства ў Вільні, арганізаванае ў Беларускім Студэнскім Саюзе, вядзе ў гэтым годзе даволі інтэнсыўную працу, перадусім на культурна-нацыянальным груньце.

Праца Бел. Студ. Саюзу разьбіваецца ў некалькіх паасобных галінах, а імённа: галіна музыкальна-драматычная, навукова-рэфэратная, выдавецкая і галіна самапомачы.

За два апошнія месяцы працы ў апошнім акадэмічным годзе ўдалося шмат чаго зрабіць даволі паважнага ў усіх вышазначаных галінах, а іменна: было наладжана некалькі спэктакляў-вечарынаў, публічных і закрытых рэфэратаў, выдана № 1 (12) „Студэнскае Думкі", а так-жа з спэцыяльна адведзенага фонду праз Беларускае Дабрадзейнае Таварыства даюцца незаможным студэнтам зваротныя стыпэндыі і кароткатэрміновыя пазыкі.

Варта адзначыць, што ў апошні мамэнт нашае студэнства зьвярнула асаблівую ўвагу на грамадскае выпрацоўваньне сваіх сяброў у духу высокіх народных ідэалаў. У гэтым кірунку пачынаюць ладзіцца спэцыяльныя дыскусіі з кароценькімі рэфаратамі на актуальныя грамадзкія і навукова-культурныя тэмы, каб, супольна абгаварываючы розныя пытаньні, выпрацаваць правільны беларускі пагляд на беларускую адраджэнскую справу.

+ **Сёлетні гадавы зьезд „АБСА".** Сёлетні гадавы Зьезд „АБСА"—(Аб'яднаньня Беларускіх Студенскіх Арганізацыяў) адбудзецца ў Празе Чэскай дня 30 сьнежня б. г. На гэты Зьезд маецца выехаць дэлегацыя ад Беларускага Студэнскага Саюзу ў Вільні.

+ **„Беларускі Праваслаўны Царкоўны Камітэт"** Нас просіць зьмясьціць наступнае паведамленьне.

„Шматлічныя пытаньні, з якімі зьвяртаюцца праваслаўныя беларусы з рожных мясцоў Заходняе Беларусі як да рожных беларускіх цэнтральных установаў, так і да паасобных беларускіх культурна-грамадзкіх дзеячаў, а такжа ненормальныя варункі нашага царкоўнага жыцьця паслужылі падставаю для ўтварэньня ў Вільні Беларускага Праваслаўнага Царкоўнага Камітэту.

„Дзеля гэтага прапануецца ў будучыні прысылаць у Камітэт усе матэрыялы аб царкоўным жыцьці, неадпаведнасьці і шкоднасьці для сучаснага царкоўнага і нацыянална-грамадзкага жыцьця тых ці іншых асобаў, сьцьвярджаючы гэную неадпаведнасьць і шкоднасьць фактамі".

„Па ўсім такім пытаньням Камітэт будзе даваць адказы як у пісьмах, так і ў прэсе.

Адрэс Камітэту: Вільня, Вастрабрамская 9".

+ **Ад Рэдакцыі.** У першым нумары нашае часопісі, на-жаль, аказалася вельмі многа карэктарскіх абмылак. Асабліва пацярпеў верш С. Сарокі „Наперад", у якім некаторыя словы так скажаны, што зусім зьмянілі думку аўтара. За гэтыя хібы Рэдакцыя перапрашае паважаных чытачоў і супрацоўнікаў.

## Адкрыты ліст

### да Сэкрэтарыяту Беларускага-Сялянска-Работніцкага Пасольск. Клюбу ў Вільні.

Каля 20 верасьня, хтось, відавочна, з маючых аднолькавае са мной прозьвішча ў в. Гародзьках, дастаў ад Віленскага Сэкрэтарыяту Белар.-Сялянска-Работніцкага Пасольскага Клюбу ліст з 17 верасьня, ды ў тым-жа канвэрце уложаныя праклямацыі проці іншых беларускіх дзеячоў. Ліст быў адрасаваны на маё імя, з паказаньнем імя майго бацькі і як з тэксту гэтага лісту вынікае, ён быў адказам на быццам пасланы мной ліст у сэкрэтарыят, каторага **я запраўды ніколі не пасылаў**. Аб лісьце гэтым і праклямацыях я даведаўся толькі цяперака.

Дзеля таго, што дзейнасьць вышменаванага Клюбу ўважаю вельмі шкоднай для беларускай справы, дык з імі ня меў жадных зносінаў і ня пісаў жаднага лісту; тым болей дзівіць мяне прысылка вышменаваных праклямацыяў.

**Міхал Анупрэяў Станкевіч.**

В. Гародзькі
21.X. 1929 г.



# Карэспандэнцыі.

### Ня хочуць даць роднае школы!
(Места Пружаны).

У нашым месьце ёсьць польская пачатковая школа, у якой пераважаючую большасьць вучняў складаюць праваслаўныя беларускія дзеці. Шмат ужо разоў бацькі—беларусы хацелі зьмяніць польскую школу на беларускую, але справа неяк стаяла на мейсцы. Урэшце падалі палескаму куратару заяву аб стварэньні беларускай школы ў м. Пружанах на лік дзяцей, які якраз вымагаецца законам. Доўга куратар не адказываў, а ўрэшце даў такі адказ.

У м. Пружанах на вуліцы Хватцы жыве адзін гаспадар Леоновіч. На хаце яго напісана выразна—Leonowicz. Сам Леоновіч кажа, што ён Леоновіч. Урэшце ўся вуліца гукае яго Леоновічам. Дык вось гэты самы Леоновіч падпісаў дэкларацыю на трох дзяцей (усяго падана было на сорак). Пан куратар у паперы свaей адказаў, што школы ня можа адчыніць, бо 1) у месьце няма 25% беларусаў (па сьпісу люднасьці 1924 году) і 2) што Леоновіч—неправідловае прозьвішча, бо ў магістраце, быццам, Леоновіч падпісаўся Leonowski.

Але-ж браточкі! У 1924 годзе ў Пружанах аб беларускім руху ведала толькі некалькі можа асоб, а ў гэтым годзе?—пабачце! уся інтэлігенцыя тутэйшая (бо нятутэйшая—прыехала з Польшчы) усьвядомлена ўжо нацыянальна. А паглядзіце навакол Пружанаў—у кожнай вёсцы вы пабачыце беларускія кніжкі. Дык ня можна мерыць 1929 год—1924-ым годам! А другі пункт куратаравага адказу дык зусім дзіўны: бо, здаецца, Леоновіч піша толькі па расейску. Дык як-жа мог тады напісаць па польску—Leonowski? А ўрэшце, браточкі, як можна казаць чалавеку, што ён не Леоновіч, калі сам ён кажа: „Я Леоновіч, Якуб Леоновіч, мяне ўся вуліца ведае", а яму пан куратар адказывае: „Ты не Леоновіч, а Леоновскі!"

І як тут не сьмяяцца!? Але вось, сьмех сьмехам, а школы так і не даюць. Трэба-ж нешта рабіць далей, бо нас могуць і ня толькі так запісаць... Хто хоча здабыць, той здабудзе ўсё.

Пружанец.

### Разьбіваюць Маладзечанскую воласьць.

Хіба ня было ў Беларусі іншай такой моцнай, дужай воласьці, як нашая маладзечанская. Яна адзначалася й велічынёй, і добрай гаспадаркаю. Вялікае значэньне для воласьці так-жа мае ейны асяродак, м. Маладзечна, з вузлом зялезных дарогаў і вялікімі таргамі. А калі Маладзечна сталася местам павятовым, дык значэньне яго для воласьці яшчэ павялічылася.

Хто-б мог спадзявацца, што якраз цяперака ўрадніцкім галовам прыйдзе ўдум скасаваць нашую воласьць? А тым часам так ёсьць, павятовы стараста касуе маладзечанскую воласьць, дзелячы яе паміж валасьцьмі суседнімі—Лебедзеўскай, Красьненскай і інш. Гэткім парадкам гаспадары з-пад Маладзечна, што ўсе свае патрэбы здавалялі ў сваім мястэчку, цяпер, маючы патрэбу ў воласьці, прымушаны будуць ехаць за 12 вёрстаў у Лебедзева. І ўсё гэта робіцца бяз згоды самых валашчанаў, каторыя дзівяцца з гэткіх парадкаў, бядуюць ды абураюцца. Чаму пав. соймік згадзіўся на гэты падзел? Але што-ж, калі ў нас соймікі такія, якіх хочуць мець панове старасты. Адзінай хіба прычынай падзелу нашае воласьці ёсьць тое, што маладзечанскі магістрат хоча забраць сабе наш валасны будынак.

П. Гародзька.

## Валожынскі магістрат і беларускія ратрэбы.

Ужо зараз будзе тры чэцьверці году, як у м. Валожыне ёсьць магістрат. Ня трэба хіба казаць, што, з выняткам Жыдоў, усё іншае насяленьне Валожына беларускае. Праўда, ё яшчэ некалькі дзесяткаў наехалых на ўрады Палякаў, але пры выбарах у самаўрад гэта значэньня ня мае. Дык меская рада ў Валожыне павінна была-б складацца з трох чэцьверцяў Беларусаў і аднае чэцьверці Жыдоў. На жаль, з прычыны нашай няпоўнай сьвядомасьці ды неарганізаванасьці Беларусы толькі палову складаюць мескае рады— ёсьць 6-ёх Беларусаў, 3-ох Жыдоў і 3-ох Палякоў, апошнія запраўды нікога не прадстаўляюць у мескай радзе. Але гэта яшчэ ня ўсё. Ня глядзячы на значную лічбу Беларусаў радных, рада несправядліва адносіцца да беларускіх патрэбаў. Гэтак рада прызнала на польскую ўрадовую школу, г. зн. забясьпечаную ўрадам 6.000 (шэсьць тысячаў!) памогі, на жыдоўскую прыватную 1.200 (тысяча дзьвесьце) і на беларускую прыватную ў тым-жа Валожыне (у Панізьзі) толькі 750 (семсот пяцьдзесят).

Гэна-ж рада абрала за бурмістра польскага шовіністычнага асадніка, капітана Шведа, каторы вельмі нягодна ядносіцца да Беларусаў. Бурмістр Швэд дагэтуль ня выплачуе беларускай школе прызнаных ёй радаю 750 зал. Гэтыя і іншыя адносіны валожынскага бурмістра паказуюць, што ён не лёяльны да насяленьня, катораму павінен служыць.

Ведама, які бурмістр, такая й тая служба, каторую ён заняў да працы ў магістраце. Гэтак сэкрэтар магістрату адмаўляецца ня толькі гаманіць, але й разумець пабеларуску. Ен кажа, што ён паходзе з Падольля, дзеля таго пабеларуску не разумее, хоць запраўды ён з суседняй Бакшчанскай воласьці. Дзеля таго, што бурмістр Швэд яўна спракудзіўся, што ён нелёяльны ў вадносінах да валожынскага насяленьня, што ўважае сябе за пана, а іншых за сваіх прыганятых, меская рада павінна звольніць яго з бурміст-роўства, а з ім і ягонага „падольскага“ сэкратара.

**Выбіральнік.**

**Хто прышле падпіску ня менш, як ЗА ПАЎГОДУ наперад, атрымае ДАРМА месячны адрыўны Календар на 1930 год.**

### „Міністэрская“ пэнсія асадніка Шведа.

Непрыяцель беларускага народу, асаднік Швэд ёсьць кіраўніком касы „Стэфчыка“ ў Валожыне. За гэта ён дастае ў месяц каля 500 зал. пэнсіі і каля 300 зал. процэнтаў ад зваротку ў касе (а не за пазычаныя грошы), разам каля 800 зал. Гэны-ж Швэд, як валожынскі бурмістр, дастае пэнсіі ў месяц 650 зал. Разам, значыцца, Швэд дастае ў месяц пэнсіі каля 1450 (тысяча чатырыста пяцьдзесят) зал. Навет ваявода дастае шмат меншую пэнсію за Шведа, бо гэта-ж проста міністэрская пэнсія. І зьбіраюцца гэтыя грошы з бедных людзёў, з каторых ні адзін вясной ня мае чаго ў рот улажыць. Дакуль меская рада будзе цярпець гэта?!

**Шчырак.**

Перачытаўшы газэту — передай другому.

## Беларусы ў Латвіі.

### „Школа і жыцьцё“.

У Рызе ў найбліжэйшым часе пачне выходзіць беларуская пэдагогічная і літэратурна-грамадзкая штомесячная часопісь „Школа і жыцьцё“, орган беларускага вучыцельства, які ставіць сваёй галоўнай мэтай:

1) асьвятленьне пытаньняў навучаньня і працоўнага выхаваньня ў сямьі і школе.

2) пашырэньне паступовых пэдагогічных ідэяў сярод дзеячоў школы, бацькоў вучняў і наагул сярод беларускага грамадзянства, грамадзкіх і прафэсыянальных арганізацыяў, якія працуюць для мэтаў школьнае і пазашкольнае асьветы.

**„Школа і жыцьцё“** выходзіць штомесячна.

**„Школа і жыцьцё“** хоча даць сваім падпісчыкам багаты і цікавы пэдагогічны зьмест, так і праўдзівае асьвятленьне гісторыі разьвіцьця і становішча латышскіх, беларускіх і іншых школ у Латвіі; — адбіць як у люстры ўсё жыцьцё, працу, надзеі, гора і радасьць беларускага вучыцеля ў Латвіі, — пазнаёміць яго са становішчам вучыцялёў іншых школак як у Латвіі, так і заграніцаю; зрабіць шэраг гістарычных экскурсыяў у мінулае беларускае школы і культуры

**„Школа і жыцьцё“** орган **незалежны і беспартыйны.**

Да ўдзелу ў супрацоўніцтве запрашаюцца ўсе беларускія пэдагогічныя сілы, як Латвіі, так і заграніцы, а таксама выдатнейшыя грамадзкія і школьныя дзеячы латышскае і іншых нацыяльнасьцяў. Супрацоўніцтва абяцаў цэлы рад культурных дзеячоў Заходняе Беларусі.

Артыкулы для друкаваньня надсылаюцца па адрасу: **Riga, Tumes iela № 2, „Школа і жыцьцё“.**

Рукапісы, надасланыя ў Рэдакцыю, павінны быць напісаны ясна, на адной староньцы балонкі з подпісам аўтара і яго дакладным адрасам.

Падпісная цана на 1 год: з дастаўкаю і перасылкаю ў Латвіі — 20 латаў; заграніцу — 5 амэрыканс. даляраў.

Падпіска прымаецца толькі на 1 год і ½ году.

Адрэс рэдакцыі: Latvija, Riga, Tumes iela 2, тэл. 22127.

Адказны Рэдактар: **Мікола Дзямідаў.**

Выдавец: **„Т-ва Беларускіх Вучыцялёў у Латвіі“.**



## Беларусы ў Чэхаславаччыне.

(Карэспандэнцыі з Прагі).

### I.

Беларуская калёнія ў Празе Чэскай да апошніх часоў зьяўлялася досыць значным фактарам культурна-палітычнага жыцьця замежнай Беларусі. Большасьць гэтае калёніі складала перадусім студэнская моладзь, лічба якой даходзіла ў 1923 годзе да 150 асоб, і толькі адзінкі спасярод яе былі гэт. зв. грамадзяне старэйшыя, якіх выкінула рэвалюцыйная сумятлівасьць за межы Бацькаўшчыны. Вось-жа гэткім чынам увесь цяжар працы культурна-грамадзкага характару ў шырэйшым маштабе выпаў на долю беларускага студэнства. Яшчэ зарана пісаць гісторыю Праскае беларускае калёніі, аднак трэба сьцьвердзіць, што гэты час набліжаецца. Большасьць студэнства ўсё-ж выпаўніла сваё заданьне — скончыла вышэйшыя школы й вярнулася або вяртаецца на Бацькаўшчыну пад розны палітычны падзел яе.

Ня прыходзіцца яшчэ шмат казаць і аб лёсе гэтых „пражакаў“. У той час, як у Празе яны прадстаўлялі моцную грамаду, хоць і з рожнымі палітычнымі ахварбоўкамі, дык цяпер гэтая грамада губляецца ў этнаграфічным беларускім моры. Ствараецца разброд, у той час, як і ў Празе інтэнсыўнасьць працы натуральна паменшылася да мінімума, а неўзабаве можа нават зусім зьнікнуць. Адзінай моцнай арганізацыяй у Празе зараз зьяўляецца „Аб'еднаньне Беларускіх Студ. Арганізацыяў“ (АБСА), якая бароніць беларускую студэнскую, і наагул беларускую справу на міжнародным форуме. Есьць яшчэ пару грамадзкіх беларускіх інстытуцыяў, але яны ізноў-жа стаяць на шляху ліквідацыі з прычыны рэпатрыяцыі.

Цэлы рад розных беларускіх студэнскіх арганізацыяў, як асноўных характэрных праяваў руху беларускага ў Празе, ужо даўно здалі свае дакумэнты ў створаны беларускі Архіў. Будучы дасьледчык беларускае працы ў Ч. С. Р. знойдзе шмат цікавага матэр'ялу аб тым запале й энтузыязме рожных пачынаньняў, з якім нават часта было не пад сілу справіцца пры неадпаведных варунках эміграцыйнага жыцьця беларускае моладзі. Заданьнем беларускага грамадзянства зараз ёсьць падтрыманьне гэтае праскае заграьічнае пляцоўкі, забясьпечаньне матэр'яльнае „АБСА“ й прыняцьце актыўнага ўдзелу ў пашырэньні створанага ўжо беларускага архіву, хоць-бы праз надсыланьне пэрыядычнага беларускага друку (Praha II, Venzigora č. 4, prof. Veršinin pro belorusky archivum).

Разам з гэтым трэба, каб беларускія абсольвэнты праскіх высокіх школаў падумалі над аднаўленьнем цэнтру сваей дзейнасьці ў краі, а не забіваліся ў свой мядзьвежы кут і зарасталі павуцінай мяшчанскага супакою.

**Зубровіч.**

### II.

Пэўне вас задзівіць тое, што за найважнейшую вестку, якой сягоньня дзялюся з вамі, лічу ўтварэньне новага ўраду Чэхаславакіі, у якім сацыялісты маюць ажно сем міністэрскіх партфэляў — у тым ліку гэткія важныя, як народная асьвета, замежныя справы, цэны прадуктаў і інш. І зрабілася гэта супраць вельмі моцнага націску тутэйшага „чорнага інтэрнацыяналу“ — клерыкалаў, якія за адно міністэрства асьветы гатовы былі аддаць усё! Ды дарэмна: сацыял-дэмакраты стаяць крэпка на варце, каб ніводзін езуіт не ўвайшоў да школы. Трэба бо вам ведаць, што ў Чэхаславакіі навука Рэлігіі законамі дзяржаўнымі ў школах забаронена, і гэта страшэнна мучыць астаткі рэакцыйных недабіткаў, што асталіся ў спадчыне па клерыкальнай Аўстрыі, імпэратар якое насіў тытул кардынала.

Дык вось, выясьню вам, чаму нас, студэнтаў, гэтак цешыць перамога сацыялістаў. Адно — тое, што маё сацыялістычнае сэрца ня можа з гэтага ня цешыцца; а другое — факт гэты мецімe для нас, студэнтаў, важныя практычныя вынікі. Не дарма вестку гэту студэнты ў унівэрсытэце прывіталі з бурнай радасьцяй: сацыялістычны міністар асьветы будзе бараніць здабытае студэнтамі права на ледзь не дармовую язду ў трамваях, на ледзь не дармовы ўваход у тэатр, на танныя абеды і цёплыя памешканьні. Для нашае студэнскае галіты — гэта-ж ня жарты!

Праўда, студэнтаў-беларусаў тутака цяпер ужо ня шмат, але ўсё-ж тыя, якія ёсьць, падзяляюць шчыра радасьць сваіх чэскіх калегаў.

**Студэнт-беларус.**



Рэдактар-Выдавец: **М. Сіняўскі.** Друкарня Я. ЛЕВІНА Вільня, Нямецкая 22.